	и зачем они нужны дереву?			
VIII. Первичное закрепление «Функции стебля»	Организует заполнение кластера «Функции стебля» и просит подобрать доказательства к каждой функции.	Называют опорную, проводящую, запасающую, фотосинтезирующую функции, связывают их со строением стебля.	Кластер, работа с доказательствами.	Закреплена взаимосвязь строения и функций стебля.
IX. Практико-ориентированный кейс «Памятка садоводу-огороднику»	Объясняет понятия «прищипка» и «пасынкование», предлагает мини-кейс по выращиванию томатов.	Обсуждают, какой приём выбрать и почему, применяют знания о росте и ветвлении побега.	Кейс-метод, обсуждение.	Показана практическая значимость знаний о стебле.
X. Подведение итогов. Вердикт	Предлагает фразу «Казнить нельзя помиловать» и просит поставить запятую, аргументируя решение.	Формулируют вердикт: «Казнить нельзя, помиловать», доказывают жизненно важную роль стебля.	Проблемный итог, аргументация.	Сформулирован итоговый вывод по теме урока.
XI. Домашнее задание и рефлексия	Сообщает домашнее задание: §27; творческие задания «10 точек» или мини-презентация «Стебель растения в искусстве». Организует рефлексию «Разговор на бумаге».	Записывают домашнее задание, продолжают фразы: «Сегодня на уроке меня заинтересовало…», «Было сложно…», «Хотелось бы узнать еще…».	Индивидуальная рефлексия.	Осмыслены личные результаты и затруднения.

Дата поступления в редакцию: 27.05.2026

РЭАЛІЗАЦЫЯ ДЫФЕРЭНЦЫРАВАНАГА ПРЫНЦЫПУ Ў НАВУЧАННІ СІНТАКСІСУ БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ ПРАЗ СІСТЭМУ РОЗНАЎЗРОЎНЕВЫХ ЗАДАННЯЎ

Сямёнава Алена Юр'еўна
Лазоўская Таццяна Анатольеўна

Анатацыя. *У артыкуле раскрываецца патэнцыял дэферэнцыяцыі на ўроках беларускай мовы пры вывучэнні сінтаксісу праз рознаўзровневыя заданні. Прадстаўленая сістэма рознаўзроўневых заданняў па праграме вучэбнага прадмета "Беларуская мова" (8 клас) структуравана ў выглядзе табліцы, што дазваляе настаўніку аптымальна арганізаваць работу з вучнямі, якія маюць розны ўзровень моўнай падрыхтоўкі. Кожны блок заданняў суправаджаецца дакладна сфармуляванымі ўмовамі, формамі падачы і метадычнымі рэкамендацыямі. Матэрыял будзе карысны настаўнікам беларускай мовы і літаратуры, метадыстам і даследчыкам, якія імкнуцца ўкараняць сучасныя падыходы да індывідуалізацыі навучання.*

Сучасная адукацыйная прастора, арыентаваная на прынцыпы інклюзіі і дыферэнцыяцыі, патрабуе ад настаўніка гнуткай арганізацыі вучэбнага працэсу, здольнай улічваць разнастайнасць індывідуальных адукацыйных патрэб і магчымасцей вучняў. У адукацыйным стандарце падкрэсліваецца, што інклюзіўны падыход разглядаецца як "сукупнасць спосабаў праектавання і арганізацыі адукацыйнага працэсу, што забяспечваюць атрыманне адукацыі ўсімі навучэнцамі з улікам разнастайнасці іх асаблівых індывідуальных адукацыйных патрэб і індывідуальных магчымасцей (адоранага, таленавітага вучня, вучня, чые патрэбы абумоўлены яго жыццёвай сітуацыяй, станам здароўя або іншымі абставінамі)" [2]. Інклюзія і дыферэнцыяцыя выступаюць як абавязковыя, структурна вызначальныя прынцыпы арганізацыі адукацыйнага працэсу, якія патрабуюць сістэмнай адаптацыі зместу і метадаў навучання да разнастайнасці індывідуальных адукацыйных патрэб і магчымасцей вучняў.

Рознаўзроўневыя заданні ў навучанні беларускай мове ўмоўна падзяляюцца на некалькі асноўных відаў, кожны з якіх выконвае сваю дыдактычную функцыю і

забяспечвае паступовае ўскладненне вучэбнай дзейнасці.

Найперш вылучаюць рэпрадуктыўныя заданні, арыентаваныя на аднаўленне і дакладнае прымяненне ўжо засвоеных ведаў па зададзеным узоры: устаўце прапушчаныя літары; спішыце тэкст, расстаўляючы знакі прыпынку; падбярыце правільную форму слова; вызначце частку мовы.

Прадуктыўныя заданні запяспечваюць самастойнае прымяненне правіл у новых умовах: трансфармацыя сказа, складанне ўласных прыкладаў, аналіз моўных з'яў, вызначэнне спосабаў выражэння граматычных катэгорый. Такі вучэбны элемент развівае уменне пераносіць веды ў новыя сітуацыі, фарміруе аналітычнае мысленне і павышае ступень самастойнасці вучняў.

Творчыя заданні, што прадугледжваюць стварэнне ўласных моўных выказванняў, развіццё камунікатыўнай і даследчай кампетэнцый, якія спрыяюць развіццю камунікатыўнай, даследчай і творчай кампетэнцый: напісанне эсэ, тэкстаў, стварэнне дыялогаў, моўныя даследаванні. Яны дазваляюць вучням праяўляць індывідуальнасць, выкарыстоўваць мову як сродак самавыяўлення і фарміраваць уласны стыль маўлення.

У сучаснай методыцы шырока выкарыстоўваюцца камунікатыўныя заданні (сітуацыйныя практыкаванні, ролевыя мадэлі, маўленчыя гульні), якія мадэлююць рэальныя маўленчыя сітуацыі і ствараюць умовы для практычнага выкарыстання беларускай мовы. Асаблівую значнасць яны набываюць у сувязі з тым, што многія вучні мала чуюць беларускую гаворку па-за межамі ўстановы адукацыі, таму менавіта ўрок становіцца асноўнай прасторай жывога маўлення.

Аналітычныя заданні (разбор тэкстаў, выяўленне і выпраўленне моўных памылак, параўнальны аналіз канструкцый), якія развіваюць крытычнае мысленне, уменне бачыць моўныя заканамернасці і ацэньваць правільнасць маўлення.

Пошукава-даследчыя заданні, што патрабуюць высокага ўзроўню самастойнасці: міні-даследаванні, праекты, праца з даведачнай літаратурай, параўнанне моўных з'яў у розных кантэкстах. Яны арыентаваны на вучняў з высокім навучальным патэнцыялам і спрыяюць развіццю даследчых навыкаў, уменню фармуляваць высновы і абгрунтоўваць уласную пазіцыю.

Асабліва выразна неабходнасць дыферэнцыяцыі праяўляецца пры вывучэнні сінтаксісу — раздзела, што патрабуе сістэмнасці, паступовасці і дакладнага ўліку індывідуальных вучнёўскіх магчымасцей. Навучанне сінтаксісу патрабуе забеспячэння цеснай сувязі з вывучэннем усіх раздзелаў курса роднай мовы — лексікі, фанетыкі, арфаэпіі і марфалогіі. Абумоўлена гэта тым, што слова як лексічная адзінка ўваходзіць у склад словазлучэння і сказа ў пэўнай словаформе, значэнне якой рэалізуецца на сінтакісічным узроўні.

Сінтаксіс як раздзел граматыкі вывучае будову і значэнне словазлучэнняў і сказаў, іх структурныя тыпы. Аналіз лексіка-семантычнага напаўнення і граматычнай арганізацыі словазлучэнняў і сказаў дае магчымасць глыбока асэнсаваць структурныя і семантычныя сувязі слоў, словазлучэнняў і сказаў, удасканаліць уменні і навыкі стварэння тэксту. Практычнае засваенне сінтакасічнага ладу мовы абываецца двума шляхамі: першы — праз перайманне маўленчых узораў; другі — праз засваенне сінтакісчных паняццяў, ацэньванне сувязі слоў, словазлучэнняў і сказаў як кампанентаў тэксту. Метады і прыёмы навучання сінтаксісу абумоўлены прынцыпамі навучання і скіраваны на фарміраванне сінтаксічнай кампетэнцыі вучняў — дасведчанасці ў тэорыі і практыцы стварэння лагічна і граматычна правільных словазлучэнняў і сказаў як састаўных кампанентаў тэксту.

Сфарміраваная моўная кампетэнцыя прадвызначае станаўленне і развіццё камунікатыўнай кампетэнцыі як маўленчай дасведчанасці вучняў, аснову якой складае асобасна арыентаваная камунікатыўна-дзейнасная тэхналогія, у цэнтры якой знаходзіцца моўная асоба вучня (мэтавы кампанет) — сінтаксічная з'ява (матывацыйны кампанент) — моўныя і маўленчыя ўменні і навыкі (змаставы кампанент) — суб'ект-суб'ектнае этыка-камунікатыўнае суразмоўніцтва (аперацыйны кампенент) — рэфлексія (ацэначны кампанент).

Забяспечваецца педагагічная тэхналогія вывучэння сінтаксісу сукупнасцю агульнадыдактычных і спецыяльных (сінтаксічных) метадаў і прыёмаў (слова настаўніка, гутарка, самастойная праца вучня, назіранні, моўны аналіз і інш.). Асноўнымі сінтаксічнымі адзінкамі з'яўляюцца словазлучэнне і сказ, іх выдзяленне з тэксту і ўвядзенне ў тэкст праводзіцца ў залежнасці ад структуры, семантыкі і функцыянальнага прызначэння. Таму названыя сінтаксічныя адзінкі павінны стаць аб'ектамі аналітычнай інтэрпрэтацыі ў практыкаваннях на складанне схем і сінтаксічных канструкцый; на ўстанаўленне адпаведнасці схем і сінтаксічных канструкцый; на ўспрыманне словазлучэнняў і сказаў, выдзеленых з тэкстаў розных тыпаў, стыляў і жанраў; на выяўленне граматычных і сэнсавых сродкаў сувязі сказаў у тэксце [3].

У табліцы прадстаўлены рознаўзроўневыя заданні па раздзеле "Сінтаксіс" па праграме вучэбнага прадмета "Беларуская мова" (8 клас), дзе паказана рэалізацыя дыферэнцыраванага падыходу праз заданні.

Тэма ўрока № 1 (8 клас) **Словазлучэнне як сінтаксічная адзінка. Граматычнае значэнне словазлучэння**		
Практыкаванне	**Умова задання**	**Прыём (спосаб прадстаўлення)**
Базавы ўзровень падрыхтоўкі		
Зарослыя берагі, ляціце дарогай, адчыніць дзверы, зусім	Выпішыце словазлучэнні:	Пісьмова

спакойна, пятнаццаты дзень, абяцаў прыйсці, далёка ад дома, уважлівы вучань, чытаць кнігу, вельмі хутка, каляровы аловак, знарок спакойна.	1) дзеяслоўныя, 2) іменныя, 3) прыслоўныя.	(“Размяркуйце па групах”)
Сярэдні ўзровень падрыхтоўкі		
Гаварыць неразборліва, сорак першы, бязмерна шчаслівы, сшытак у лінейку, будзе вучыцца, зірнула нясмела, перасадзіць вясной, жаўруковая песня, хлопчык малюе, новы падручнік, таму што веру, напісаны верш, недалёка ад прыпынку, не крыўдзіў ніколі, многа грошай.	Выпішыце толькі словазлучэнні, абазначце галоўнае слова.	Пісьмова (“Знайдзіце словазлучэнне”)
Высокі ўзровень падрыхтоўкі		
Аднойчы я стаяў на ўзгорку і глядзеў у блакітнае неба.	Запішыце сказ, выпішыце ўсе словазлучэнні, пабудуйце іх схемы.	Пісьмова (“Распрані сказ”)
Тэма ўрока № 2 (8 клас) Віды падпарадкавальнай сувязі слоў у словазлучэнні: дапасаванне, кіраванне, прымыканне		
Практыкаванне	**Умова задання**	**Прыём (спосаб прадстаўлення)**
Базавы ўзровень падрыхтоўкі		
Сядзець схіліўшыся, абгорнуты падручнік, жадаць удачы, шырокае поле, пісьмо брата, дамашняе заданне, працаваць старанна, парассыпала пялёсткі, разбегліся наўкол, квяцісты луг.	Выпішыце словазлучэнні з відам падпарадкавальнай сувязі: 1) дапасаванне, 2) кіраванне, 3) прымыканне.	Пісьмова (“Размяркуйце па групах”)
Сярэдні ўзровень падрыхтоўкі		
Клёкат бусла, цагляны дом, сцэна тэатра, сад дзядулі, грыбны суп, драўляны стол, сшытак Машы, спеў птушыны, аднапавярховы дом, ільняная сукенка.	Замяніце словазлучэнні з відам сувязі “кіраванне” відам сувязі “дапасаванне” і наадварот. Запішыце новыя словазлучэнні, абазначце галоўнае слова.	Пісьмова (“Знайдзіце замену”)
Высокі ўзровень падрыхтоўкі		
Простую і дакладную мудрасць нашых продкаў цяпер амаль забылі. Простую мудрасць, дакладную мудрасць, нашых продкаў — дапасаванне; мудрасць продкаў, забылі мудрасць — кіраванне; забылі цяпер, забылі амаль — прымыканне.	Прыдумайце і запішыце сказ, у якім былі б словазлучэнні з усімі відамі падпарадкавальнай сувязі.	Пісьмова (“Прыдумайце сказ”)
Тэма ўрока № 3 (8 клас) Простыя і складаныя сказы. Развітыя і неразвітыя сказы		
Практыкаванне	**Умова задання**	**Прыём (спосаб прадстаўлення)**
Базавы ўзровень падрыхтоўкі		
А) просты сказ; Б) складаны сказ; В) развіты сказ; Г) неразвіты сказ. 1) У сваім складзе маюць адну граматычную аснову, у іх выражаецца адна закончаная думка. 2) Двухсастаўны сказ, які складаецца толькі з дзейніка і выказніка. 3) Двухсастаўны сказ, у склад якога, апрача дзейніка і выказніка, уваходзяць даданыя члены сказа. 4) У сваім складзе маюць дзве і больш граматычныя асновы.	Суаднясіце паняцці.	Вусна (“Знайдзіце адпаведнасць”)
Сярэдні ўзровень падрыхтоўкі		

1) Ціхая ноч стаяла над зямлёй, ды трапяталі ў небе далёкія зоры. 2) Раптам наляцеў цёплы вецер, і з'явіліся хмары. 3) Прачнуўшыся рана, маці прыгатавала сняданак і разбудзіла дзяцей. У запаведніку хлопчыкі і дзяўчынкі любуюцца і захапляюцца прыгажосцю зімовай прыроды. 4) Загучалі галасы, і на парозе з'явіліся госці. 5) Хмары пацямнелі, насунуліся і паліліся на зямлю цёплым дажджом.	Выпішыце простыя сказы (1 варыянт), складаныя сказы (2 варыянт), падкрэсліце граматычныя асновы.	Пісьмова ("Знайдзіце свой адказ")
Высокі ўзровень падрыхтоўкі		
1) [ ], ды [ ]. 2) [ ], (якая…). 3) Ці то [ ], ці то [ ]. 4) [ ], (бо…).	Складзіце сказы па схемах, запішыце іх, падкрэсліце граматычныя асновы.	Пісьмова ("Схемы — у сказы")
Тэма ўрока № 4 (8 клас) Галоўныя члены сказа		
Практыкаванне	**Умова задання**	**Прыём (спосаб прадстаўлення)**
Базавы ўзровень падрыхтоўкі		
Ліст, асенні, кружыцца, паветра, у. Хлопчык, чытаць, цікавы, кніга.	Складзіце сказы з дадзеных словаў і падкрэсліце ў іх граматычную аснову.	Пісьмова ("Словы – у сказ")
Сярэдні ўзровень падрыхтоўкі		
1. Яго сяброўства было сапраўднай каштоўнасцю. 2. Жадаць яшчэ не значыць мець. 3. Але — супраціўны злучнік. 4. Сем чалавек прыйшлі на сустрэчу з дэпутатам. 5. Нехта стукнуў у дзверы. 6. Старанныя заўсёды дасягаюць мэты. 7. Мірскі замак — унікальны помнік беларускай культуры. 8. Вось і прыйшло доўгачаканае лета. 9. Дзесяць дзеліцца на два. 10. Беларускі лён — гэта нацыянальнае багацце нашай дзяржавы.	Запішыце сказы, падкрэсліце дзейнікі, вызначце спосаб выражэння дзейніка.	Пісьмова ("Што скрываееца за дзейнікам?")
Высокі ўзровень падрыхтоўкі		
	Напішыце кароткі партрэт (рэальнай або выдуманай асобы), падкрэсліце граматычную аснову сказаў.	Пісьмова (Творчая праца: "Партрэт персанажа")
Тэма ўрока № 5 (8 клас) Спосабы выражэння выказніка (простага дзеяслоўнага, састаўнога дзеяслоўнага і састаўнога іменнага)		
Практыкаванне	**Умова задання**	**Прыём (спосаб прадстаўлення)**
Базавы ўзровень падрыхтоўкі		
1. Маладыя ловяць імгненні шчасця і смяюцца, як дзеці. 2. Мора было спакойнае. 3. Непагода пачала насоўвацца на бор яшчэ завідна. 4. Мы будзем змагацца за праўду. 5. Вада, зямля, агонь і паветра – чатыры зямныя стыхіі. 6. Жаншчына была сталага ўзросту. 7. Алесь папрасіў суседа па парце перадаць кнігу. 8. Настануць дні цудоўныя. 9. Я буду рад з вамі сустрэцца зноў. 10. Пяць і пяць будзе дзесяць.	Запоўніце табліцу прыкладамі са сказаў. <table><tr><td colspan="3">Выказнікі</td></tr><tr><td rowspan="2">ПДВ</td><td colspan="2">Састаўныя</td></tr><tr><td>Дз.</td><td>Ім.</td></tr><tr><td></td><td></td><td></td></tr><tr><td></td><td></td><td></td></tr><tr><td></td><td></td><td></td></tr></table>	Пісьмова ("Распазнайце выказнікі")

Сярэдні ўзровень падрыхтоўкі		
СІВ → ПДВ: Бацька – шафер. ПДВ → СДВ: Дзяўчынка танцуе. СДВ → СІВ: Яна пачала вучыцца.	Ператварыце сказы, змяніўшы тып выказніка.	Пісьмова (“Зрабіце замену”)
Высокі ўзровень падрыхтоўкі		
	Знайдзіце і запішыце невялікі тэкст у газеце (або ўрывак з літаратурнага твора). Прааналізуйце, якія тыпы выказнікаў пераважаюць? Чаму, на вашу думку?	Пісьмова (“Міні-даследаванне”)
Тэма ўрока № 6 (8 клас) **Даданыя члены сказа**		
Практыкаванне	**Умова задання**	**Прыём (спосаб прадстаўлення)**
Базавы ўзровень падрыхтоўкі		
1. З самага дзяцінства я марыла стаць лекарам. 2. Слёзы радасці стаялі ў дзедавых вачах. 3. Дакучны камарыны звон над рэчкай замірае. 4. Дзед заўсёды шчодра частаваў вяскоўцаў смачным мёдам. 5. З-за туману мы не маглі перабарацца на другі бераг возера.	Запішыце сказы, падкрэсліце ўсе даданыя члены сказа, зверху пазначце: дапаўненне, азначэнне, акалічнасць.	Пісьмова (“Знайдзіце схаваныя даданыя члены сказа”)
Сярэдні ўзровень падрыхтоўкі		
1. Вартавыя ўважліва аглядалі ціхае наваколле. 2. Хлопцы-ўмельцы хутка пачалі працаваць у полі. 3. Малінавае варэнне было надзвычай салодкае.	Запішыце сказы, зрабіце разбор па ўзору: *Кожны ў хаце займаўся сваёй справай.* *(Хто?)Кожны — дзейнік;* *кожны (што рабіў?) займаўся — просты дзеяслоўны выказнік;* *займаўся (дзе?) у хаце — акалічнасць месца;* *займаўся (чым?) справай — ускоснае дапаўненне;* *справай (чыёй?) сваёй — дапасаванае азначэнне.*	Пісьмова (“Распраніце сказ”)
Высокі ўзровень падрыхтоўкі		
1. Ён выйшаў з дому, калі прайшоў дождж і сціх вецер. 2. Усе пачулі, як прыгожа спяваюць птушкі. 3. Калі мы апынуліся ў летнім лесе, нас акружылі птушыныя спевы. 4. Мы прыехалі сюды, каб добра адпачыць на беразе возера. 5. Калі я вярнуўся дадому, я адразу лёг спаць.	Перабудуйце складаназалежныя сказы ў простыя з аднароднымі даданымі членамі.	Пісьмова (“Сінанімічная канструкцыя”)
Тэма ўрока № 7 (8 клас) **Аднасастаўныя сказы. Віды аднасастаўных сказаў**		
Практыкаванне	**Умова задання**	**Прыём (спосаб прадстаўлення)**
Базавы ўзровень падрыхтоўкі		
Тэст А) пэўна-асабовыя — Б) няпэўна-асабовыя — В) абагульнена-асабовыя — Г) безасабовыя — Д) назыўныя — 1) абагульненае дзеянне (усякі, кожны). Дзеяслоў у форме 2-й асобы адз. ліку або 3-й асобы мн. ліку.	Суаднясіце віды аднасастаўных сказаў з іх тыпамі.	Вусна (“Распазнайце і супастаўце”)

2) дзеяслоў у форме 3-й асобы мн. ліку (цяперашняга або будучага часу) або мн. ліку прошлага часу. 3) абазначаюць стан або дзеянне, якое адбываецца без удзелу асобы. Дзеяслоў у форме безасабовага стану (на -цца, -цца) або неазначальнай формы. 4) галоўны член — прадмет, выражы назоўнікам у назоўным склоне. Абазначаюць існаванне прадмета, з'явы. 5) дзеяслоў у форме 1-й або 2-й асобы адз. або мн. ліку (цяперашняга або будучага часу).		
Сярэдні ўзровень падрыхтоўкі		
1. У кнізе цікава апавядаецца пра падарожжы. 2. Раніца. Туман. 3. Паклікай тады на дапамогу дзядзьку Антона. 4. Зусім хутка сцямнее. 5. У нашым горадзе будуюць новы мост. 6. Якая прахалодная вадзіца! 7. Пайшоў бы прагуляцца. 8. Зараз не пішуць лістоў, а дасылаюць смспаведамленні. 9. Напішы яму, Алеська, ды хутчэй. 10. Не рабі ліхога і не бойся нікога.	Запішыце. Вызначыце від аднасастаўных сказаў.	Пісьмова ("Пазнайце від сказа")
Высокі ўзровень падрыхтоўкі		
	Напішыце мініяцюру (апісанне начнога неба), выкарыстоўваючы аднасастаўныя сказы.	Пісьмова ("Стварыце мастацкі вобраз")
Тэма ўрока № 8 (8 клас) Сказы з адасобленымі членамі		
Практыкаванне	**Умова задання**	**Прыём (спосаб прадстаўлення)**
Базавы ўзровень падрыхтоўкі		
1. Лес, пакрыты снегам, здаваўся казачным. 2. Яны ўдваіх, *сынок і маці*, з двара ідуць у бок ракі. 3. *Моцны і халодны* вецер прабіваўся наскрозь. 4. Мікалай дапіў чай *не спяшаючыся*. 5. Пры гэтай хаце, *апрача сянец*, нічога не было. 6. У глыбіню лесу вяла зарослая *травою* сцяжынка. 7. Дзед, *пасядзеўшы крыху*, зноў узяўся за работу. 8. Ён пасоўваў акуляры на тоўсты сіняваты нос, прымацоўваючы іх ніткамі *замест аглаблец*. 9. Але ж вядома, што Беларусь, *за выключэннем крайніх паўднёвых мясцін*, не ведала мангола-татарскага нашэсця. 10. Крынічка, *спакойная на паверхні*, выкідала з глыбіні сваёй пясчаныя фантанчыкі.	Скажыце, ці з'яўляецца выдзелены член сказа адасобленым.	Вусна ("Так ці не")
Сярэдні ўзровень падрыхтоўкі		
1. Хлопчык абуты ў цёплыя валёнкі выбег на вуліцу. 2. Настаўніца Мар'я Іванаўна выклікала мяне да дошкі. 3. Нягледзячы на стому альпіністы працягвалі ўзыходжанне. 4. Захопленыя гульнёй акцёраў гледачы не заўважылі пажару. 5. Сонечны прамень прабіўшыся праз хмары асвятліў паляну. 6. Неба усыпанае зоркамі спусцілася на верхаліны дрэў. 7. Хлопец захапіўшыся чытаннем не чуў званка. 8. Наш сусед сталявар па прафесіі вельмі добры чалавек. 9. У некаторыя палескія вёскі акрамя лодкі нічым не дабярэшся. 10. Захопленыя прыгажосцю прыроды мы зусім забыліся пра нашага сябра.	Запішыце, пастаўце знакі прыпынку, падкрэсліце адасобленыя члены сказа як члены сказа, вызначце, чым яны выражаны.	Пісьмова ("Чатыры крокі")
Высокі ўзровень падрыхтоўкі		

Неба, ззяючае ад тысяч зорак, здавалася блізкім-блізкім, дасягальным рукой. Ад ракі, ціхай і спакойнай у гэту ноч, падымаўся лёгкі туман. Дарога, звілістая, нібы вужак, цягнулася паміж палеткаў, парослых высокай, яшчэ зялёнай жытнёвай травою. Станіслаў, стомлены доўгім днём, ішоў, абапёршыся на кій, ледзь перасоўваючы ногі. Ён думаў пра дом, пра агонь у печы, такі прывабны і цёплы, і пра бясконцыя размовы з бацькам — чалавекам мудрым, хоць і простага роду. Раптам, не чакаючы таго ніводнай хвіліны, ён убачыў унізе, каля самай вады, цень. Нерухомы і незразумелы, ён напалохаў Станіслава больш, чым бы гэта зрабіў які-небудзь шум.	Прааналізуйце фрагмент з аповесці Уладзіміра Караткевіча "Каласы пад сярпом тваім", падкрэсліце адасобленыя члены сказа як члены сказа. Растлумачце, які ўплыў яны аказваюць на выразнасць тэксту.	Пісьмова (“Міні-даследаванне”)

Тэма ўрока № 9 (8 клас)
Пабочныя словы, словазлучэнні і сказы і іх пунктуацыйнае афармленне

Узровень	Практыкаванне	Умова задання	Прыём (спосаб прадстаўлення)
Базавы ўзровень падрыхтоўкі			
	1. Вядома, Света прыйдзе да нас у госці. 2. Гэта, на маю думку, вельмі цікавы фільм. 3. Ты, мусіць, яшчэ не зрабіў хатнюю працу? 4. Дарэчы, ты ўжо бачыў новы будынак? 5. Па-першае, трэба планаваць, па-другое, дзейнічаць. 6. Такім чынам, наша рашэнне з’яўляецца канчатковым. 7. Яе позірк, мне здалося, быў вельмі насцярожаным. 8. Іншымі словамі, ты мяне не зразумеў.	Запішыце сказы, падкрэсліце ў іх пабочныя словы і словазлучэнні, вызначце, якое значэнне яны маюць.	Пісьмова (“Распазнайце з’яву”)
Сярэдні ўзровень падрыхтоўкі			
	1. На шчасце дождж хутка спыніўся. 2. Гэта падзея паводле сведак адбылася вельмі хутка. 3. Іншымі словамі мы дамовіліся. 4. Гэты стары парк на думку мясцовых жыхароў заснаваны яшчэ ў пачатку стагоддзя. 5. Гэта быў на жаль няўдалы эксперымент. 6. Напэўна заўтра будзе сонечна. 7. З аднаго боку гэта была творчая і цікавая праца з другога навучанне патрабуе шмат намаганняў.	Запішыце сказы, расстаўце знакі прыпынку, вызначце, якое значэнне маюць пабочныя словы і словазлучэнні.	Пісьмова (“Каскапад”)
Высокі ўзровень падрыхтоўкі			
	Дом быў пабудаваны ў мінулым стагоддзі. Ён знаходзіцца ў цэнтры горада. Зараз у ім размяшчаецца музей. Музей працуе з 10 да 18 гадзін. У ім праводзяцца экскурсіі.	Перапрацуйце дадзены сухі, факталагічны тэкст, дадаўшы пабочныя словы і ўстаўныя канструкцыі, каб зрабіць яго больш жывым, эмацыянальным, паказваючы аўтарскае стаўленне.	Пісьмова (“Канструктар тэксту”)

Тэма ўрока № 10 (8 клас)
Звароткак. Неразвітыя і развітыя звароткі,
іх выдзяленне ў вусным і пісьмовым маўленні

Практыкаванне	Умова задання	Прыём (спосаб прадстаўлення)
Базавы ўзровень падрыхтоўкі		
1. Мілая матуля як ты сябе адчуваеш? 2. Мой родны горад я заўсёды вяртаюся да цябе. 3. Паважаныя госці увага. 4. Вучні адчыніце вокны. 5. Я вельмі сумую па табе бабуля. 6. Сябры мы сёння ідзём у паход. 7. Я так чакаю цябе мая дарагая сяброўка. 8. Зямля мая нідзе я такой красы і велічы не бачыў. 9. Мора люблю я тваё сваволле, люблю тваю буру і ціхую гладзь.	Падзяліце сказы на дзве групы: 1) з неразвітым звароткам, 2) з развітым звароткам. Запішыце, расстаўце знакі прыпынку.	Пісьмова (“Сартаванне”)

10. Дарагія бацькі і настаўнікі вашы дзеці дасягнуць поспеху, калі вы іх падтрымаеце.		
Сярэдні ўзровень падрыхтоўкі		
1. *Калегі* прыйшлі да мяне ў госці. 2. Шумныя *хвалі* б'юцца аб бераг. 3. *Хлопцы* ідуць гуляць у снежкі. 4. Мае *сябры* разам чыталі гэту паэму. 5. *Ліда* паказала нам новы фільм пра восень. 6. *Зіма* размалявала акно дзіўнымі ўзорамі. 7. *Сябар* дапаможа ў бядзе. 8. *Аляксей* ужо здаў экзамен па беларускай мове. 9. *Людзі* радаваліся сонцу і цяплу. 10. *Настаўнік* расказвае нам пра Вялікую Перамогу ў вайне над нямецка-фашысцкімі захопнікамі.	Перабудуйце сказы, каб выдзеленае слова, якое з'яўляецца дзейнікам, стала звароткам, расстаўце неабходныя знакі прыпынку.	Пісьмова (“Зваротак-двайнік”)
Высокі ўзровень падрыхтоўкі		
	Напішыце невялікі маналог-зварот (5–7 сказаў) ад імя капітана карабля да сваёй каманды перад бурай. Выкарыстоўвай развітыя звароткі.	Пісьмова (“Маналог-зварот”)

Такім чынам, шматвектарнасць, зададзеная ў практыкаваннях, забяспечвае комплекснае развіццё моўнай кампетэнцыі вучняў. Заданні для базавага і сярэдняга ўзроўняў ўключаюць падбор слоў, выкананне элементарных граматычных аперацый, класіфікацыю моўных адзінак. Заданні павышанай складанасці патрабуюць стварэння звязных выказванняў, аналізу тэкстаў, аргументацыі і ўдзелу ў дыскусіях. Разнастайнасць заданняў улічвае індывідуальныя асаблівасці вучняў і дазваляе кожнаму выбудоўваць уласную адукацыйную траекторыю.

Дыферэнцыраваны падыход выступае адным з эфектыўных метадаў павышэння якасці навучання беларускай мове. Ён дазваляе адаптаваць вучэбны матэрыял да індывідуальных магчымасцяў кожнага, ствараць умовы для паступовага інтэлектуальнага росту, развіцця моўнай кампетэнцыі і фарміравання ўстойлівай матывацыі да вывучэння прадмета. Узроўневая арганізацыя заданняў спрыяе стварэнню інклюзіўнага адукацыйнага асяроддзя, у якім вучні з розным узроўнем моўнай падрыхтоўкі атрымліваюць роўны доступ да ведаў і магчымасць дасягнення ўласнага адукацыйнага поспеху.

Спіс літаратуры

1. Вучэбная праграма па вучэбным прадмеце “Беларуская мова” для V–IX класаў устаноў адукацыі, якія рэалізуюць адукацыйныя праграмы агульнай сярэдняй адукацыі, з беларускай і рускай мовамі навучання і выхавання от 29.07.2025 №134 // Нацыянальны адукацыйны партал. — URL: https://adu.by/images/2026/ucebnye-programmy-po-predmetam/Belaruskaa-mova/up-bel-mova-6-9kl.pdf (дата звароту: 01.06.2026).

2. Образовательный стандарт общего среднего образования: утв. постановлением Мин-ва образования Республики Беларусь от 28.11.2025 №199 // Национальный образовательный портал. — URL: https://adu.by/ru/homeru/obrazovatelnyj-protsess/obshchee-srednee-obrazovanie.html (дата обращения: 01.06.2026).

3. Протчанка, В. У. Шматаспекты аналіз пры вывучэнні сінтаксісу беларускай мовы : вучэб. дапам. для студэнтаў аддзяленняў філал. факультэтаў педагагічных інстытутаў В.У. Протчанка. — Мінск : Вышэйшая школа, 1987. — 144 с.

Дата поступления в редакцию: 01.06.2026